Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Прарэктар па навуковай рабоце БДУКМ

_______________ В.Р.Языковіч

«24» чэрвеня 2019 г.

Рэгістрацыйны № ВД-135 /эвуч.

# САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*1-23 80 02Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*Прафілізацыя: Культурная спадчына і музеялогія*

2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Рэг. № Е23-2-002/ пр-тып. ад 21.03.2019

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;

*А.А. Крыштаносава,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю.А. Косік,* выкладчык кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі;

*Н.Л. Баліч,* загадчык адзела рэгіянальнай сацыялогіі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № 12 ад 31.05.2019 г.);

Прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

(пратакол № 01 ад 12.06.2019 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Сацыяльна-культурная антрапалогія” звязана з шырокім колам вучэбных дысцыплін гуманітарнага цыкла: культуралогіяй, філасофіяй, сацыялогіяй, мастацтвазнаўствам, семіётыкай культуры і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – сфарміраваць уяўленне аб культурнай антрапалогіі як аб адной з вядучых культуралагічных дысцыплін, аб шляхах даследавання чалавечага напаўнення культуры і ў цэлым аб культуры як антрапалагічным феномене.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

– вызначыць месца сацыяльна-культурнай антрапалогіі ў структуры культуралогіі;

– даць уяўленне пра культурна-антрапалагічны падыход і адпаведныя метады да сацыякультурных феноменаў;

– даць уяўленне аб антрапалагічных мадэлях мінулага і сучаснасці;

– з дапамогай вывучэння тэарэтычнай спадчыны аўтараў навучыць аналізаваць антрапалагічныя характарыстыкі культурных эпох.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны» прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці ІІ ступені 1-23 80 02 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны:

УПК-4. Быць здольным інтэрпрэтаваць фундаментальныя культурныя універсалы і адрозненні грамадства на лакальным і рэгіянальным узроўні.

СК-2. Быць здольным вырашаць прафесійныя задачы ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага і айчыннага заканадаўства, маральнымі і этычнымі стандартамі.

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сацыяльна-культурная антрапалогія» 108 гадзін, аудыторных – 36 гадзін,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лекцыйныя заняткі - 20, практычныя заняткі - 16. Рэкамендаваная форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны

Культурная антрапалогія ў сферы сучасных культуралагічных ведаў.

Прадмет, мэты, задачы і метадалогія вучэбнай дысцыпліны. Гісторыя антрапалагічных вучэнняў ад Арыстоцеля да З. Фрэйда. Сістэматыка антрапалогіі. Спецыфіка сучаснага культурна-антрапалагічнага дыскурса.

### Тэма 1. Паходжанне чалавека і яго ўнікальнае становішча ў прыродзе і культуры

Паходжанне і сутнасць чалавека. Канцэпцыя дуальнасці чалавека: чалавек як мікракосм і макракосм. Чалавек як адзінства душы, духу і цела. Дылема "Прырода – Свабода" як культурна-антрапалагічная спецыфіка чалавека. Ж.-П. Сартр і М. Бярдзяеў аб свабодзе чалавека.

### Тэма 2. Аксіясфера культуры

Кампаненты аксіясферы: культурныя сэнсы, каштоўнасці, нормы і ідэалы. Сэнс як аснова культуратворчай дзейнасці. Вучэнне аб сэнсе В. Франкла. Сэнс жыцця і смерці. Сэнсаўтваральны характар культуры.

### Тэма 3. Камунікатыўны аспект культуры

Канцэпт "Іншы" і дынаміка адносін да Іншага ў культурна-гістарычным працэсе. Функцыі Іншага ў жыцці чалавека і культуры. Паняцці "Я–Ты", "Я–Яно" ў М. Бубера. Канцэпцыя асіметрычнага дыялога Э. Левінаса. "Я" і "Мы": асоба ў сістэме сацыякультурных інтэракцый.

### Тэма 4. Асоба і культура

Асоба ў культуры: працэс развіцця. Трыяда "індывід – індывідуальнасць – асоба"; яе развіццё ў гісторыі культуры. Гістарычны працэс як шлях да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўлення асобы. Спецыфічныя характарыстыкі асобы. Пазіцыя чалавека ў архаіцы.

## Тэма 5. Чалавек Антычнасці і Сярэднявечча

Праблема асобы ў антычнасці. Сацыяцэнтрызм антычнага светабачання. “Полісная свядомасць” як перашкода чалавечай індывідуальнасці. Позняя антычнасць: пастаноўка праблемы чалавека (творчасць Сафокла, Эўрыпіда; рымскі скульптурны партрэт). Сярэднявечча: нараджэнне індывідуальнасці ў прасторы манаскай, рыцарскай і народнай культуры. Адносіны “чалавек – Бог” як практыка сярэднявечнай самасвядомасці. Зараджэнне культуры буржуа і каштоўнасць індывідуалізму ў познім Сярэднявеччы.

## Тэма 6. Рэнесансная асоба

Рэнесанс як “адкрыццё свету і чалавека” (Я. Буркхард). Рэнесансныя гуманісты: стыль жыцця і мыслення. Гуманісты як першыя інтэлігенты. Гуманістычная парадыгма: мэты, каштоўнасці, ідэалы. Пачатак фарміравання сучасных установак у эпоху Рэнесанса. Рэлігія ў свядомасці чалавека Адраджэння. Праблемы і супярэчнасці гуманістычнай парадыгмы.

## Тэма 7. Новы час: канфлікты і метамарфозы асобы

Дынаміка асобы Новага часу: ад энцыклапедыста Асветы да чалавека масы. Тыпы асобы ў Новы час: рамантык, “чалавек-вінцік”, бунтар, кансумерыст і інш. Постструктуралісцкая пазіцыя “дэгуманізацыі”. Праблематычнасць чалавека ў сучаснасці. Тэзіс аб смерці чалавека (М. Фуко).

## Тэма 8. Экзістэнцыяльныя феномены быцця чалавека: каханне, вера, смерць

Каханне як феномен культуры. Каханне – пачуццё і канцэпт. Тыпалогіі кахання. Каханне і Эрас. Дынаміка разумення кахання ў заходнееўрапейскай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце веры. Вера і веды. Вера і рэлігія. Вера і атэізм. Бог і чалавек. Паняцці “дабра” і “зла” ў кантэксце культурна-рэлігійнай традыцыі.

Роля смерці ў культуры. Сэнс смерці. Права на смерць. Смерць і неўміручасць. Смерць у заходнееўрапейскай культуры: дынаміка адносін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(дзённая форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | КСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | |
| Тэма 1. Паходжанне чалавека і яго ўнікальнае становішча ў прыродзе і культуры | 1 | | | |
| Тэма 2. Аксіясфера культуры | 2 | | | |
| Тэма 3. Камунікатыўны аспект культуры | 2 | 2 | 2 | Аналітычны даклад |
| Тэма 4. Асоба і культура | 2 | 2 | 2 | Напісанне эсэ |
| Тэма 5. Чалавек Антычнасці і Сярэднявечча | 2 | 2 | | |
| Тэма 6. Рэнесансная асоба | 2 | 2 | | |
| Тэма 7. Новы час: канфлікты і метамарфозы асобы | 2 | 2 | 2 | Прэзентацыя |
| Тэма 8. Экзістэнцыяльныя феномены быцця чалавека: каханне, вера, смерць | 2 | 2 | 2 | Вуснае апытанне |
| Разам | 16 | 12 | 8 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(завочная форма атрымання адукацыі)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі |
| Уводзіны | 1 | |
| Тэма 1. Паходжанне чалавека і яго ўнікальнае становішча ў прыродзе і культуры | 1 | |
| Тэма 2. Аксіясфера культуры | 1 | |
| Тэма 3. Камунікатыўны аспект культуры | 1 | 2 |
| Тэма 4. Асоба і культура | | 2 |
| Разам… | 4 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Губин, В.* Философская антропология / В. Губин, Е. Некрасова. – М.: Университетская книга, 2000. – 234 с.

2. *Гуревич, П. С.* Философская антропология / П. С. Гуревич. – М.: Nota Bene, 2001. – 456 с.

3. *Кон, И.С.* В поисках себя: личность и ее самосознание / И.С. Кон. – М.: Политиздат, 1984. – 335 с.

4. *Чернявская, Ю. В.* Введение в культурно-философскую антропологию: пособие для студентов / Ю.В. Чернявская. – Минск: БГУ, 2003. – 281 с.

5. *Чернявская, Юлия.* Личность и культура: пособие для учителей, классных руководителей, студентов / Юлия Чернявская. – Минск: Беларусь, 2003. – 208 с.

*Дадатковая*

1. *Альтшуллер, Г. С.* Как стать гением: жизненная стратегия творческой личности / Г. С. Альтшуллер, И. Верткин. – Минск: Беларусь, 1994.– 497 с.

2. *Бергсон, А.* Два источника морали и религии / А. Бергсон. – М.: Канон, 1994. – 384 с. – (История философии в памятниках).

3. *Бердяев, Н. А.* Философия свободы. Смысл творчества / Н. А. Бердяев. – М.: Правда, 1989. – 608 с.

4. *Бубер, М.* Два образа веры / М. Бубер. – М.: Республика, 1995. – 464 с. – (Мыслители XX века).

5. *Гарин, И.* Что такое философия? / И. Гарин. – М.: ТЕРРА-Книжный клуб, 2001. – 752 с.

6. *Джемс, В.* Многообразие религиозного опыта / В. Джемс. – СПб.: Андреев и сыновья, 1992. – 424 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Мамардашвили, М.* Эстетика мышления / М. Мамардашвили. – М.: Московская школа политических исследований, 2001. – 416 с.

8. *Марков, Б.В.* Философская антропология. Очерки истории и теории / Б.В. Марков. – СПб.: Лань, 1997. – 384 с.

9. *Кассирер, Эрнст.* Избранное. Опыт о человеке / Эрнст Кассирер. – М.: Гардарика, 1998. – 784 с. – (Лики культуры).

10. *Франкл, В.* Человек в поисках смысла / В. Франкл. – М.: Прогресс, 1990. – 368 с. – (Библиотека зарубежной психологии).

11. *Шелер, М.* Положение человека в космосе / М. Шелер // Проблема человека в западной философии. – М.: Прогресс, 1988. – С. 31–95.

12. *Ясперс, Карл.* Введение в философию/ Карл Ясперс. – Минск: Пропилеи, 2000. –191 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады і тэхналогіі навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню магістрантаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыцця вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі;

– гульнявыя тэхналогіі;

– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці магістрантаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для вызначэння вучэбных дасягненняў магістранта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў магістранта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны ўжываюцца наступныя формы самастойнай работы:

– работа магістрантаў з навуковай і вучэбна-метадычнай літаратурай, з першакрыніцамі, самастойнае вывучэнне асобных пытанняў вучэбнай дысцыпліны, падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў і экзамену;

– кантралюемая самастойная работа ў выглядзе выканання індывідуальных заданняў, у тым ліку пісьмовых апытанняў з кансультацыямі выкладчыка;

– падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах і прадстаўленне дакладаў з прэзентацыямі на семінарскіх занятках.

Выкананая работа павінна адлюстроўваць ступень засваення магістрантам тэарэтычных пытанняў, уменне самастойна мысліць, лагічна разважаць, ставіць пытанні, абагульняць, вызначаць праблемы, рабіць высновы.

## Пералік прыкладных форм выканання кантралюемай самастойнай работы магістрантаў

– напісанне рэферата;

– распрацоўка тэставых заданняў па вывучаемых тэмах;

– падрыхтоўка прэзентацыі;

– практычная работа з выкарыстаннем кейс-метаду (метаду сітуацыйнага аналізу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ